Учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка »
Факультет эстетического образования
Кафедра теории и методики преподавания искусства

# Песенный репертуар для подбора аккомпанемента на занятиях по дисциплине «Основы музыкальной грамоты» (раздел «Гармония»)

для студентов специальностей
«Музыкальное искусство, ритмика и хореография»
«Музыкальное искусство и мировая художественная культура»

ХРЕСТОМАТИЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Составитель: Бычкова Н.В.

Минск, 2016

## Список песен русских советских и белорусских композиторов

1. И. Любан. Бывайце здаровы.
2. М. Блантер. Катюша.
3. И. Дунаевский. Песенка о капитане Гранте.
4. В. Шаинский. Чему учат в школе.
5. В. Раинчик. Калыханка.
6. В. Шаинский. Вместе весело шагать.

## Список белорусских народных песен

1. Зялены дубочак, шырокі лісточак
2. А ў полі вярба нахілёная
3. Камар лазню тапіў
4. Кума мая, кумачка
5. Спі, сыночак міленькі
6. Чаму ж мне не пець
7. Бульба
8. Із далекіх із краёў
9. Балада аб партызанцы Галіне
10. Купалінка
11. Лявоніха
12. Мікіта
13. Ой, рана на Йвана
14. Ох, і сеяла Ульяніца лянок
15. Пайшоў Ясь наш на лужок
16. Саўка ды Грышка ладзілі дуду
17. Юрачка
18. Рэчанька
19. Як пагнала бабуленька куранятак пасці
20. Янка-полька

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# БЫВАЙЦЕ ЗДАРОВЫ

Белорусская народная песня

Слова **И. Любана** | Музыка **А. Русака**

**Подвижно**




1. Бывайце здаровы,
Жывіце багата,
А мы ад’язджаем
Дадому, дахаты.
У зялёнай дуброве
Мы начаваць будзем.
Эх! Вашае ласкі
Вавек не забудзем.

2. У вашым калгасе
Шырокае поле,
Няхай жа на шчасце
Цвяце ваша доля.
На рэчках на вашых
Бурлілі бы воды,
Каб плавалі з крыкам
Гусей карагоды.

3. Каб жыта ў полі
Трубою вялося,
Каб сала ў хаце
Кублямі вялося.
Штодзень у капусце
Каб плавала скварка,
А к скварцы часінай
Вялася б і чарка.

4. Яшчэ вам жадаем
Прыбытку ў хаце –
Не мала, не многа –
Штогод па дзіцяці
Не будзе вам крыўды
Яшчэ і за тое,
Калі пашанцуе
На год і па двое.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# КАТЮША

Слова **М. Исаковского** Музыка **М. Блантера**

**Не скоро**




1. Расцветали яблони и груши,
Поплыли туманы над рекой.
Выходила на берег Катюша,
На высокий берег, на крутой.

2. Выходила, песню заводила
Про степного сизого орла,
Про того, которого любила,
Про того, чьи письма берегла.

3. Ой ты, песня, песенка девичья,
Ты лети за ясным солнцем вслед
И бойцу на дальнем пограничье
От Катюши передай привет!

4.Пусть он вспомнит девушку простую,
Пусть услышит, как она поет,
Пусть он землю бережет родную,
А любовь Катюша сбережет.

5. Расцветали яблони и груши,
Поплыли туманы над рекой.
Выходила на берег Катюша,
На высокий берег на крутой...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПЕСНЯ О КАПИТАНЕ

из кинофильма «Дети капитана Гранта»

Слова **В. Лебедева-Кумача** Музыка **И. Дунаевского**




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Жил отважный капитан,
Он объездил много стран
И не раз он бороздил океан.
Раз пятнадцать он тонул,
Погибал среди акул,
Но ни разу даже глазом не моргнул.
И в беде, и в бою
Напевал он всюду песенку свою:

Но однажды капитан
Был в одной из дальних стран
И влюбился, как простой мальчуган.
Раз пятнадцать он краснел,
Заикался и бледнел,
Но ни разу улыбнуться не посмел.
Он мрачнел, он худел,
И никто ему по-дружески не спел:

*Припев*: Капитан, капитан, улыбнитесь,
Ведь улыбка – это флаг корабля!
Капитан, капитан, подтянитесь –
Только смелым покоряются моря.

*Припев*

## ЧЕМУ УЧАТ В ШКОЛЕ

из музыкальной сказки «Дважды два – четыре»

Слова **М. Пляцковского** Музыка **В. Шаинского**




1. Буквы разные писать
Тонким перышком в тетрадь
Учат в школе, учат в школе, учат в школе.
Вычитать и умножать,
Малышей не обижать
Учат в школе, учат в школе, учат в школе.

2. К четырем прибавить два,
По слогам читать слова,
Учат в школе, учат в школе, учат в школе.
Книжки добрые любить
И воспитанными быть
Учат в школе, учат в школе, учат в школе.

3. Про глагол и про тире,
И про дождик на дворе
Учат в школе, учат в школе, учат в школе.
Крепко-накрепко дружить
С детства дружбой дорожить
Учат в школе, учат в школе, учат в школе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# КАЛЫХАНКА

Словы **Г. Бураўкіна** Музыка **В. Раінчыка**




1. Доўгі дзень, цёплы дзень
Адплывае за аблокі.
Сіні цень, сонны цень
Адпаўзае ў кут далёкі.
Збеглі зайкі ўсе ў лясы.
Змоўклі птушак галасы.
І буслы ў гняздо схавалі
Свае доўгія насы.

*Прыпеў:* Баю-бай, баю-бай,
Вачаняты закрывай.

2. Пакрысе на расе
Патухаюць зоркі-сплюшкі.
Гулі ўсе, казкі ўсе.
Пахаваны пад падушкі.
Спяць і мышкі, і стрыжы.
Спяць машыны ў гаражы.
Ты таксама каля мамы
Ціха-ціхенька ляжы.

*Прыпеў.*

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

# ВМЕСТЕ ВЕСЕЛО ШАГАТЬ

Слова **М. Матусовского** Музыка **В. Шаинского**




*Припев:* Вместе весело шагать по просторам,
По просторам, по просторам!
И, конечно, припевать лучше хором,
Лучше хором, лучше хором!

1. Спой-ка с нами, перепелка, перепелочка!
Раз иголка, два иголка – будет елочка!
Раз дощечка, два дощечка – будет лесенка!
Раз словечко, два словечко – будет песенка!
*Припев.*

2. В небесах зари полоска заполощется.
Раз березка, два березка – будет рощица!
Раз дощечка, два дощечка – будет лесенка!
Раз словечко, два словечко – будет песенка!
*Припев.*

3. Нам счастливую тропинку выбрать надобно.
Раз дождинка, два дождинка – будет радуга!
Раз дощечка, два дощечка – будет лесенка!
Раз словечко, два словечко – будет песенка!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗЯЛЁНЫ ДУБОЧАК, ШЫРОКІ ЛІСТОЧАК




Зялёны дубочак,
Шырокі лісточак.
*2 р.* Куды вецер вее,
Туды голлі гнуцца.

Куды вецер вее,
Туды голлі гнуцца.
*2 р.* Па ветру да мілай
Ўсе весці нясуцца.

Сягоння субота,
А заўтра нядзеля,
*2 р.* – Чаму ў цябе, хлопча,
Кашуля не бела?

– Як жа будзе бела,
Хоць заўтра нядзеля:
*2 р.* Мамка ў мяне стара,
Сястра ў мяне мала.

Мамка ў мяне стара,
Сястра ў мяне мала,
*2 р.* Дзяўчына кахана
Любіць перастала.

Пераплыву рэчку,
Сяду на брусочку,
*2 р.* Ці не прыйдзе міла
Памыць мне сарочку?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# А Ў ПОЛІ ВЯРБА НАХІЛЁНАЯ




А ў полі вярба
Нахілёная,
*2 р.* Маладая дзяўчынонька
Заручоная.

Заручоная
І запітая,
*2 р.* Тады яе запівалі,
Як сад зацвітаў.

Як сад зацвітаў,
Як зара ўзышла,
*2 р.* Маладая дзяўчынонька
Па ваду ішла.

Кася ад вады,
Яся да вады:
*2 р.* – Пастой, пастой, мая Кася,
Дай каню вады.

– Як буду твая,
Напаю каня,
*2 р.* З зімненькае крынічэнькі,
З поўнага вядра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# КАМАР ЛАЗНЮ ТАПІЎ




Камар лазню тапіў,
Муха парылася.
*Прыпеў:* Дылі, дылі, дылі,
Го-ца-ца-ца,
Ой, дыль, дыль, дыль,
Го-ца-ца.

Ды с палка зваліласся
І на смерць забілася.
*Прыпеў*

Едзе жук да папа,
Да запечанага клапа.
*Прыпеў*

А поп часу не мае,
Прусака спавядае.
*Прыпеў*

Прэ блаха на мышы,
Ужо муха без душы.
*Прыпеў*

Пакуль муху памылі,
Пук лучыны спалілі.
*Прыпеў*

Пакуль муху прыбралі,
Пявуны запяялі.
*Прыпеў*

Зайцы яму капалі,
Лісы труну збівалі.
*Прыпеў*

Совы муху няслі,
Ваўкі голас вялі.
*Прыпеў*

У пясочку хавалі
І памінкі спраўлялі.
*Прыпеў*

Вылі ўсе, галасілі,
Выпілі, закусілі.
*Прыпеў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## КУМА МАЯ, КУМАЧКА




Кума мая, кумачка,
Дзе жывеш? – *2 р.*
Чаму мяне ў госцейкі
Не завеш – *2 р.*

Ці ты, куме, розуму
Пытаеш? – *2 р.*
Ці ты маёй хатачкі
Не знаеш – *2 р.*

А вунь мая хатачка
Ля вады, – *2 р.*
З высокага дзераўца
З лебяды. – *2 р.*

Яшчэ к таму сенечкі
Прыляту – *2 р.*
З харошага дзераўца,
З асату. – *2 р.*

Тады цябе ў госцейкі
Пазаву, – *2 р.*
Як свежае рыбачкі
Навару. – *2 р.*

А свежая рыбачка –
Акунёк, – *2 р.*
А любенькі госцічак –
Мой кумок! – *2 р.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# СПІ, СЫНОЧАК МІЛЕНЬКІ




Спі, сыночак міленькі,
Галубочак сізенькі.
Мой сыночак будзе спаць,
А я буду калыхаць.

Нашто, вецер, ты гудзеш,
Спаць Міхаську не даеш?
Спі, сыночку міленькі,
Ой, да люлі, люленькі...

Успомніш матку ты сваю,
Як цябе люляла,
Як табе у ноч не раз
Песню я спявала.

*Для дачкі:*

Спі, дачушка мілая,
Галубачка сізая.
Мая дочка будзе спаць,
А я буду калыхаць.

Нашто, вецер, ты гудзеш,
Спаць Марысі не даеш?
Спі, дачушка малая,
А я цябе люляю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЧАМУ Ж МНЕ НЕ ПЕЦЬ




Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Калі ў маёй хатаньцы
Парадак ідзець?

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Мушка на вакенцы
У цымбалкі б’ець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Павучок на сценцы
Кросенцы снуець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Мой сынок ў калысцы,
Як бычок равець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Парсючок пад лаўкаю
Бульбачку грызець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Петушок на сметнічку
Зерняткі дзяўбець.

Чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Сучачка на лычку
Хатку сцеражэць.

Дык чаму ж мне не пець,
Чаму ж не гудзець,
Калі ў маёй хатаньцы
Парадак ідзець?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# БУЛЬБА




Гарні, гарні бульбу з печы
У торбачку ды на плечы,
У торбачку ды нясі, –
Скажаш дзякуй, як з’ясі.

*Прыпеў:*
Трам-там-там, та-ра-та-та-та-та-там,
Скажаш дзякуй, як з’ясі.
Трам-там-там, та-ра-та-та-та-та-там,
Трам-там, ці-рам, та-ра-ра-рам.

Бульбу пякуць, бульбу вараць,
Бульбу ядуць, бульбу хваляць,
З бульбы клёцкі, з бульбы каша –
Вот такая доля наша.

*Прыпеў*

Ай, да туры, растатуры,
Я шляхецкай сам натуры:
Адзін лапаць, другі бот,
А я шляхціц, далібог!

*Прыпеў:*
Трам-там-там, та-ра-та-та-та-та-там,
А я шляхціц, далібог!
Трам-там-там, та-ра-та-та-та-та-там,
Трам-там, ці-рам, та-ра-ра-рам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ІЗ ДАЛЁКІХ ІЗ КРАЁЎ




Із далёкіх із краёў
Шлі салдацікі дамоў.
Эй, шлі салдацікі дамоў.

Па вузенькай дарожцы
Запыліла вочы ім.
Эй, запыліла вочы ім.

То пясочак, то не дым,
То Радзіма – не Берлін!
Эй, то Радзіма – не Берлін!

Вот і роднае сяло
На прыгорачку відно.
Эй, на прыгорачку відно.

Выхадзіце, сёстры, брацця,
Пераможцаў сустракаці.
Эй, пераможцаў сустракаці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# БАЛАДА АБ ПАРТЫЗАНЦЫ ГАЛІНЕ




Над ракою ў спакою
Расцвітала каліна,
*2 р.* А ў сяле за ракою
Вырастала дзяўчына.

На каліну-маліну
Прылятала зязюля,
*2 р.* Да дзяўчыны Галіны
Прыглядаўся Януля.

За ракой, дзе Галіна,
Сенажаці касілі,
*2 р.* А ў сяле, дзе Януля,
У паход затрубілі.

Перастала каліна
У цвяточкі ўбірацца,
*2 р.* Перастала Галіна
З сваім мілым відацца.

Бедавала зязюля,
Што цвяточкаў не стала.
*2 р.* Бедавала матуля,
Што дзяўчына прапала.

Падняла восень хвалі
У рацэ пад калінай,
*2 р.* Пайшлі ў бой партызаны –
Там была і Галіна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# КУПАЛІНКА




Купалінка, купалінка,
Цёмная ночка,
Цёмная ночка,
Дзе ж твая дочка?

Мая дочка у садочку
Ружу, ружу поліць,
Ружу, ружу поліць,
Белы ручкі коліць

Кветачкі рвець, кветачкі рвець,
Вяночкі звівае,
Кветачкі звівае,
Слёзкі пралівае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЛЯВОНІХА




А Лявоніху Лявон палюбіў,
Лявонісе чаравічкі купіў;
Лявоніха, душа ласкавая,
Чаравічкамі палясківала.

Як я, молада, ў матульки была,
Як вішэнька у садочку, цвіла;
Цвіла, цвіла ды пацвітывала,
З малайцамі ды пагулівала.

Папалася злому духу – мужыку,
Ссушыў мяне, як ліcцінку у духу, –
А чаму ж цябе пярун не забіў,
Як ты мяне маладую палюбіў.

Наехала повен двор казакоў,
Ўзялі, ўзялі майго мужа у палон.
Ой, не жаль мне, што яго узялі,
Толькі жалка, што не моцна звязалі.

Ой, не жаль мне, што яго узялі,
Толькі жалка, што не моцна звязалі:
Ён, паганец, уцячэць, уцячэць,
Мне галоўку натаўчэць, натаўчэць.

А Лявоніха не жонка была,
Не мытую мне кашулю дала, –
Не мытую, не качаную,
У суседа пазычаную.

Ай, Лявоніха, Лявоніха мая,
Несалёную капусту дала.
А Лявона дык і чорт не бярэць:
Несалёную капусту жарэць.

*Сучасныя прыпеўкі*
*(дадатак да першых двух строф)*

Ой, Лявоніха, Лявоніха мая,
Ты такою прыгажуняй не была.
Як збяромся мы у свята пагуляць,
Нам Лявоніхі сваёй не пазнаць.

Ах, Лявоніха, Лявоніха мая,
Ты сягоння, нібы ружа, расцвіла,
Расцвіла буйнымі кветкамі
З добрым мужам, да і з дзеткамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# МІКІТА




А Мікіта жыта паша,
А я рада, – поле наша!
*Прыпеў:* Мікіта, Мікіта,
Так і гэтак, Мікіта.

А Мікіта жыта косіць,
А я рада, – есць не просіць.
*Прыпеў*

А Мікіта вее жыта,
А я рада, што аббіта.
*Прыпеў*

А Мікіта жыта меле,
А я рада, што так веле.
*Прыпеў*

А Мікіта муку сее,
А я рада, што умее.
*Прыпеў*

А Мікіта ў печы паліць,
А я рада, што кухарыць.
*Прыпеў*

А Мікіта хлеб саджае,
А я рада, што гуляю.
*Прыпеў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ОЙ, РАНА НА ЙВАНА




Ой, рана на Йвана. (2 р.)
Процi Йвана ночка мала.
Ой, рана на Йвана. (2 р.)

Ой, рана на Йвана. (2 р.)
Дзе, Купала, начавала?
Ой, рана на Йвана. (2 р.)

Ой, рана на Йвана. (2 р.)
Начавала ў чыстым полі.
Ой, рана на Йвана. (2 р.)

Ой, рана на Йвана. (2 р.)
Чым, Купала, вячэрала?
Ой, рана на Йвана. (2 р.)

Ой, рана на Йвана. (2 р.)
Вячэрала белым сырам.
Ой, рана на Йвана. (2 р.)

Ой, рана на Йвана. (2 р.)
Чым, Купала, запівала?
Ой, рана на Йвана. (2 р.)

Ой, рана на Йвана. (2 р.)
Запівала гарэліцай.
Ой, рана на Йвана. (2 р.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ОХ, І СЕЯЛА УЛЬЯНІЦА ЛЯНОК




Ох, і сеяла Ульяніца лянок,
Ох, і сеяла Іванаўна лянок.
*Прыпеў:*
Ох, сэрца лянок,
Мая радасць ты, лянок.
Ўсё бялюсенькі кужалёк!
*Прыпеў*

Ох, палола Ульяніца лянок,
Ох, палола Іванаўна лянок.
*Прыпеў*

Ох, ірвала Ульяніца лянок,
Ох, ірвала Іванаўна лянок.
*Прыпеў*

А сарваўшы, у снапочкі ставіла,
А сарваўшы, у снапочкі ставіла.
*Прыпеў*

Ох, і слала Ульяніца лянок,
Ох, і слала Іванаўна лянок.
*Прыпеў*

Ох, і мяла Ульяніца лянок,
Ох, і мяла Іванаўна лянок.
*Прыпеў*

Ох, і прала Ульяніца лянок,
Ох, і прала Іванаўна лянок.
*Прыпеў*

Ох, і ткала Ульяніца лянок,
Ох, і ткала Іванаўна лянок.
*Прыпеў*

А саткаўшы, ды сарочак нашыла,
А саткаўшых, ды бялёвых нашыла.
*Прыпеў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПАЙШОЎ ЯСЬ НАШ НА ЛУЖОК




Пайшоў Ясь наш на лужок, (*2 р.*)
Накасіў атавачкі ён стажок. (*2 р.*)

Пайшоў Ясь наш спачываць (*2 р.*)
І сваю Настулечку стаў чакаць. (*2 р.*)

А Настулька не прыйшла, (*2 р.*)
Маці дома ёй работачку знайшла. (*2 р.*)

– Чакай, Яська, да пары, (*2 р.*)
Аж да самай да ночанькі, да зары. (*2 р.*)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# САЎКА ДЫ ГРЫШКА ЛАДЗІЛІ ДУДУ




Саўка да Грышка ладзілі дуду,
Павесяліцца ды прагнаць нуду,
(*2 р.*) Дуду, дуду, дуду, дуду,
Ды прагнаць нуду.

Як разышліся музыкі, гуга,
Згінула гора, згінула туга.
(*2 р.*) Гу-га-га-га, гу-га-га-га,
Згінула туга.

Дзядок старэнькі, ёмкі ўзяўшы скрут,
Кіем на дзверы паказаў ім тут.
(*2 р.*) Ту-ту-ту-ту, ту-ту-ту-ту,
Паказаў ім тут.

– Вы сабе дуйце сваё го-ца-ца,
Толькі не страшце малога хлапца.
(*2 р.*) Го-ца-ца-ца, го-ца-ца-ца,
Малога хлапца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЮРАЧКА




Эх ты, Юрачка, што не жэнішся,
Прыйдзе зімачка, дзе падзенешся?
Твая хата, як свірон, –
Без падлогі, без вакон…
Эх ты, Юрачка, што не жэнішся?

Эх ты, Юрачка, што не жэнішся,
Прыйдзе зімачка, дзе пагрэешся?
Ні ў дзень белы на пячы,
Ні пад коўдрай на уначы…
Эх ты, Юрачка, што не жэнішся?

Эх ты, Юрачка, час жаніціся,
Каб было к каму прытуліціся.
Калі будзеш ў шапку спаць,
Могуць дзевак разабраць…
Эх ты, Юрачка, час жаніціся!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РЭЧАНЬКА




Ой, рэчанька, рэчанька,
Чаму ж ты не поўная?
Люлі, люлі, люлі,
Чаму ж ты не поўная?

Чаму ж ты не поўная,
З беражком не роўная?
Люлі, люлі, люлі,
З беражком не роўная?

А як жа мне поўнай быць,
З беражкамі роўнай плыць?
Люлі, люлі, люлі,
З беражкамі роўнай плыць?

Янка коніка паіў,
Маня воду чэрпала.
Люлі, люлі, люлі,
Маня воду чэрпала.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЯК ПАГНАЛА БАБУЛЕНЬКА КУРАНЯТАК ПАСЦІ




Захацела бабуленька
Разам збагацеці,
Пасадзіла курачку,
Каб вывела дзеці.
Ды нямного, толькі трое,
Куранят прыждала;
Не паспелі з гнязда злезці, –
Пасвіць іх пагнала.

Як пагнала бабуленька
Куранятак пасці,
Сама села на пянёчку
Кудзелечку прасці.
Яшчэ нітак не ссучыла,
А ўжо двух згубіла,
Туды-сюды павярнулась –
Ды на трэцяе спаткнулась.

– Ой, божа ж мой,
А што ж мне рабіці?
Як прыедзе дзед із лесу,
Будзе мяне біці.
Бедна, бедна, бедна я,
Бедна галоўка мая, будзе мяне біці!

Як прыехаў дзед із лесу
Ды да сваёй хаты,
Пытаецца у бабулькі:
– А дзе ж куранята?
Цып, цып, цып, цып, цып, цып, цып!
Пуль, пуль, пуль, пуль, пуль, пуль, пуль!
А дзе ж куранята?

– Як не ведаў, дзеду,
Так не будзеш ведаць.
Вот садзіся лепш за стол –
Дам табе абедаць.
Хадзі, хадзі, галубок,
Дам табе абедаць.

Разгневаўся дзедка,
Схапіў саламінку,
Пабіў бабцы, пахвастаў
Галаву і спінку.
Ой, ёй, ёй, ёй, ёй, ёй, ёй! (*2 р.*)
Галаву і спінку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ЯНКА-ПОЛЬКА**




Янка стаіць на гары,
А я стаю у даліне,
Янка сее кавуны,
А я – журавіны.
Журавіны не ўзышлі,
Кавуны пасохлі,
Ка мне хлопцы не прыйшлі,
Каб яны падохлі.

Я на рэчцы хусткі мыла,
Ды на плот павесіла,
Дзесяцёх ўсяго любіла,
Аднаго пацешыла.
Чаго, Янка, ты галосіш, –
Я цябе пацешу,
Ды пашыўшы зрэбну торбу,
На шыю павешу.

Свеціць ясна з неба зорка,
А дзе ж гэта мой Міколка?
Каля рэчкі грэбелька,
Дзе ж падзеўся Хведарка?
Паміж лесу прыгарок,
Дзе ж падзеўся Рыгарок?
Адцураліся, не йдуць:
Мусіць, мяне забудуць?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ